# АГЛЯД ПУБЛІКАЦЫЙ, ПРЫСВЕЧАНЫХ УДЗЕЛУ ЖАНЧЫН У ПРАТЭСТАВЫХ АКЦЫЯХ 2020 ГОДА

Вера Дзядок

REVIEW OF PUBLICATIONS, DEDICATED TO THE PARTICIPATION OF WOMEN IN PROTESTS OF 2020

© Vera Dziadok

Translator, publicist, MA student of the “Cultural Heritage Development” program at European Humanities University

Email: dzyadok.vera@student.ehu.lt
ORCID ID: 0000-0001-5856-6160

Падзеі 2020 года ў Беларусі прыцягнулі да яе ўвагу творчых асоб, журналістаў і даследчыкаў з розных краін. Пра гэтыя траўматычныя падзеі распавядаюць фільмы, спектаклі і мастацкія выставы.

Кнігі, прысвечаныя Беларусі, выйшлі ў Бельгіі (Christophe Brackx, «*De laatste dictator in Europa. De opstand tegen Loekasjenko*»), Швецыі (Julia Tsimafejeva, «*Dagar i Belarus*»), Польшчы (Edyta Banaszkiewicz, «*Marsz Białorusi: sierpień – grudzień 2020*»). У Германіі з’явілася адразу некалькі кніг, прысвечаных падзеям 2020 года ў Беларусі: «*Stimmen der Hoffnung*», «BELARUS! *Das weibliche Gesicht der Revolution*», «*Die Revolution hat ein webliches Gesicht*» Вольгі Шпарагі і, нарэшце, «*Die Frauen von Belarus*» Эліс Бота.

Тры апошнія з названых кніг эксплiцытна прысвечаны ўдзелу жанчын у пратэставых падзеях 2020 года.

Агляд гэтых трох выданняў будзе дапоўнены навуковымі аспектамі ўдзелу жанчын у падзеях 2020-га, якія былі прадстаўлены на Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі ў Коўне ў кастрычніку 2021 года.

Кніга «Беларусь! Жаночае аблічча рэвалюцыі» выдавецтва «*edition*.fotoTAPETA» выйшла яшчэ ў лістападзе 2020 года і сабрала пад сваёй вокладкай самыя разнастайныя погляды, каментары і дакументы, прычым аўтаркі — выключна жанчыны. Па гарачых

This work is licensed under a Creative Commons Attribution-Noncommercial-No Derivative Works 4.0 International License


ISSN 2538-886X (online)

слядах падзей тут друкуюцца і важныя сведчанні часу, і допісы з сацыяльных сетак, і паэзія. Кніга прадстаўляе ўдалую камбінацыю з тэкстаў нямецкіх (Дыяна Зіберт, Гун-Брыт Колер) і беларускіх аўтарак, а таксама беларусак, якія жывуць і працуюць у Германіі.

У прадмове падкрэсліваецца, што рэвалюцыя ў Беларусі мае мноства абліччаў, і яна не можа лічыцца толькі жаночай, але за ёю замацаваўся менавіта жаночы вобраз.

Цэнтральнае месца ў пошуку адказу на пытанне аб феміністычным характары рэвалюцыі займае артыкул Ірыны Саламацінай, феміністкі і сябры ГА «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын».

Ірына сцвярджае, што беларуская рэвалюцыя не мае жаночага аблічча. У адрозненне ад многіх іншых аўтараў, якія падкрэсліваюць унікальнасць падзей 2020 года, Ірына вяртае іх у гістарычны кантэкст і згадвае «забытыя» прыклады ўдзелу жанчын у палітыцы ў новай гісторыі Беларусі: кандыдаткі ў прэзідэнты Наталля Машэрава (2001) і Таццяна Караткевіч (2015). Тым не менш яна адзначае, што «жаночая» павестка ніякім чынам не артыкулявалася падчас выбараў 2020 года. Праблемы хатняга гвалту або дыскрымінацыі жанчын у аплаце працы не становяцца тэмай ні для дэпутатаў Нацыянальнага сходу (40 % з якіх складаюць жанчыны), ні для «старой» апазіцыі. Не сталі яны тэмай і для новай апазіцыі. «Жанчыны, якія ахвяруюць сабой дзеля гетэрапатрыярхальных каштоўнасцей, падманваюць не толькі сябе саміх, але ўсіх жанчын», — піша даследчыца. Яна прыводзіць шматлікія прыклады выкарыстання мацярынства для ціску і маральнага шантажу з боку дзяржавы (пагроза пазбаўлення бацькоўскіх правоў актывістак). Агулам палітыку беларускай дзяржавы Ірына апісвае як недастаткова чуйную да жаночых праблем. Аўтарка адзначае таксама адсутнасць доўгатэрміновай самаарганізацыі жанчын і бачыць перспектыву для беларусак у фармуляванні гендарнай павесткі, якая б не служыла апраўданню ўдзелу жанчын у палітыцы, а стала падставай для падтрымкі ў барацьбе з гвалтам любой прыроды.

Таццяна Шчытцова ў сваім артыкуле падкрэслівае менавіта маральны характар рэвалюцыі і робіць выснову пра запыт з боку грамадства на правы чалавека як асноўны прынцып суіснавання ў соцыуме. Таццяна адзначае ўнікальнасць новага самавызначэння нацыі і яго адрозненне ад старой канцэпцыі этнічнага нацыяналізму, вылучае такія асаблівасці, як этыка (якая мае глыбокія гістарычныя і культурныя карані) і жаданне вызначыць нанова правілы жыцця ў грамадстве. Менавіта траўма і маральнае патрабаванне аб спыненні гвалту і сталі, на яе думку, падставай палітычнай салідарнасці. Таццяна ставіць гэту спробу ў адзін шэраг са спробамі ўтварэння дзяржавы ў 1918 годзе і пабудовы суверэннай і дэмакратычнай дзяржавы 1991–1996 гадоў. Таксама яна

падкрэслівае грамадскі запыт на перагляд савецкай спадчыны, бо савецкая сістэма ўспрымаецца як гістарычная аснова для сучаснага аўтарытарызму.

Ірына Раманава разважае пра карані гвалту ў беларускім грамадстве і адзначае ролю інстытута войска ў фарміраванні каштоўнасцей сляпога падпарадкавання і культу гвалту. Яна вылучае ў рэакцыі сілавых структур важныя элементы, характэрныя для тэрарызму. Таксама яна звяртае ўвагу на псіхалагічныя характарыстыкі прадстаўнікоў сілавых структур і падкрэслівае іх самаідэнтыфікацыю як прамых нашчадкаў НКВД.

Кніга Вольгі Шпарагі «У рэвалюцыі жаночае аблічча» выйшла на нямецкай мове ў выдавецтве «Suhrkamp» і рыхтуецца да выдання на рускай мове.

Як непасрэдная ўдзельніца падзей, аўтарка выкладае паслядоўнасць і характар таго, што адбывалася ўлетку і ўвосень 2020года. Вольга адзначае паўстанне калектыўнага жаночага суб'екта і падкрэслівае, што самаарганізацыя жанчын стала магчымай у тым ліку дзякуючы турэмнаму досведу, практыкам сястрынства і клопату. Гэты досвед, паводле Вольгі, стаў падставай для фарміравання «новай чуллівасці» (Shparaga, 2021, p. 61) — той адчувальнасці, якая, паводле Джудзіт Батлер, наўпрост звязана з актыўнасцю (Shparaga, 2021, p. 99). Жанчыны-лідаркі перадвыбарчай кампаніі, піша аўтарка, сталі той сілай, якая паказала, што жанчыны «могуць не толькі весці грамадства наперад, але і навучыць яго новай форме палітычнай улады — soft power» (Shparaga, 2021, p. 34).

Феміністычны пасыл беларускіх пратэстаў Вольга Шпарага звязвае менавіта з іх супрацьгвалтоўным характарам.

У фарміраванні новай адчувальнасці і сацыяльнай эмансіпацыі Вольга бачыць імкненне грамадства да сацыяльных повязяў, якое ўзнікла на месцы вертыкальнай дамовы з уладай, што перастала функцыянаваць (Shparaga, 2021, p. 113).

Цікава параўнаць гэтую выснову з аналізам сацыёлага Генадзя Коршунава, які ў сваім дакладзе на Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі разглядае пратэст 2020 года як вяршыню айсберга і вынік працэсаў разыходжання ўлады і грамадства, што доўжацца на працягу апошніх 5–10 гадоў. Апрача таго, паводле Коршунава, пратэсты сталі вынікам працэсу станаўлення «лакальнай сацыяльнасці», што фармавалася апошнія 15–20 гадоў: экасістэма лакальнасцей проста выйшла на паверхню пад цяжарам узрушэння ад пандэміі («Гарызантальная сацыяльнасць як вынік першага этапу беларускай рэвалюцыі»).

Робячы высновы, Вольга Шпарага спыняецца на адсутнасці трывалых грамадскіх інстытутаў, а таксама на тым, што пратэставы рух недаацаніў патэнцыял гвалту (Shparaga, 2021, p. 167). Перспектывы яна акрэслівае як шлях у постнацыянальную будучыню і робіць выснову, што патрэбныя новыя ідэі, бо канцэпцыя нацыі

дзеліць на сваіх і чужых (Shparaga, 2021, p. 212). У працэсах 2020 года ролю нацыянальнага кампанента даследчыца акрэслівае як нязначную: «Калі раней гаворка ішла пра моўна-культурныя карані беларускай нацыі, то для ўтварэння шырокіх, пабудаваных на салідарнасці альянсаў нацыянальная ідэнтычнасць не адыгрывала вялікай ролі» (Shparaga, 2021, p. 174).

За гэта аўтарка крытыкуе «старую апазіцыю» і гэтым жа тлумачыць яе беспаспяховасць (Shparaga, 2021, p. 191, 210). На жаль, пры гэтым складаецца недыферэнцыяваны вобраз «апазіцыі» і нічога не гаворыцца пра той кошт, які заплацілі «старыя апазіцыянеры» за сваю дзейнасць. Таксама не ўзгадваецца аб тым, што пасля 1996 года ўся апазіцыя дзейнічала па-за парламентам (што не зразумела нямецкім чытачам, для якіх апазіцыя – гэта абавязковая частка плюралістычнага заканадаўчага органа) і была маргіналізавана (Shparaga, 2021, p. 173). Ідэя адраджэння нацыі крытыкуецца без тлумачэння прычын, якія прывялі да з'яўлення такой ідэі (дзяржаўны тэрор і ўрбанізацыя).

Пафас гэтай кнігі натхняльны, а найбольш пранікнёныя старонкі менавіта тыя, дзе аўтарка дзеліцца сваімі асабістымі перажываннямі і назіраннямі з месца падзей.

У кнізе Эліс Бота «Жанчыны Беларусі» падаецца грунтоўная панарама падзей у краіне. Кніга будуецца на мностве інтэрв'ю з самымі рознымі жанчынамі: валанцёркамі, даследчыцамі, доктаркамі. Асаблівая ўвага надаецца партрэтам трыа палітычных дзяячак Беларусі. У першым раздзеле, прысвечаным Святлане Ціханоўскай, аўтарка параўноўвае яе з Ангелай Меркель, якую напачатку таксама не прымалі за самастойную палітычную фігуру і лічылі «дзяўчом Коля».

Менавіта ў гэтым бачыць аўтарка феміністскую гісторыю, якую ўвасабляе Святлана Ціханоўская, — гісторыю «палітычнай Папялушкі». Мільёнам жанчын у свеце знаёмы досвед, калі яны вымушаны выйсці за межы абранай сабе ролі (Bota, 2021, p. 79, 80). Так, падтрымку і натхненне прыняць на сябе палітычную ролю Святлана Ціханоўская атрымлівае ад былой прэзідэнткі Літвы Далі Грыбаўскайце.

У той жа час аўтарка робіць экскурс у становішча жанчын у Беларусі, гісторыю змагання за закон аб хатнім гвалце і развейвае міф пра эмансіпацыю савецкіх жанчын (міф, які перажыў развал СССР). Яна таксама спыняецца на электаральных паводзінах жанчын і гульнях Лукашэнкі з гэтай тэмай.

У пытанні аб жаночым характары рэвалюцыі аўтарка звяртаецца да эксперткі Ірыны Саламацінай, якая мяркуе, што такі характар рэвалюцыі з'яўляецца ілюзорным: ні самі пратэсты, ні трыа не маюць у сабе феміністкага складніка (Bota, 2021, p. 130), а апошняе ніколі не тэматызавала правы жанчын. Гэтае меркаванне пацвярджаецца таксама і вынікамі анлайн-апытання ўкраінскай

даследчыцы Вольгі Онух пра каштоўнасці пратэстоўцаў. Паводле апытання «Сацыялогія беларускага пратэсту: чаму і дзеля чаго беларусы выходзяць на вуліцы?», толькі 38 % удзельнікаў пратэстаў былі згодныя з тым, што пратэст меў мірны характар дзякуючы ўдзелу жанчын. Сярод тых, хто не ўдзельнічаў у пратэстах, з гэтым былі згодныя 74 %. Таксама ў пытаннях пра размеркаванне роляў у грамадстве і аднаполыя шлюбы людзі, што ўдзельнічалі ў пратэстах, выказвалі больш традыцыйныя погляды (Bota, 2021, p. 135).

Эліс Бота прыводзіць звесткі пра высокую ўдзельную вагу жанчын у турмах і бачнасць жанчын (ніколі раней яны не выступалі як палітычныя актары) (Bota, 2021, p. 137), але ў выніку падсумоўвае, што гэтае паўстанне ніколі не было чыста жаночай справай і не несла ў сабе феміністычнай павесткі. Проста гэтым разам жанчыны былі нашмат больш заўважнымі, чым звычайна (Bota, 2021, p. 143).

Эліс Бота падрабязна спыняецца на гвалце як калектыўным досведзе (Bota, 2021, p. 182) і звяртаецца да папярэдняй гісторыі, звязанай са сталінскім тэрорам і гвалтам падчас акупацыі ў Другой сусветнай вайне (Bota, 2021, p. 188).

Спрабуючы аспрэчыць меркаванне Ірыны Саламацінай аб «медыйным эфекце» рэвалюцыі, Эліс расказвае гісторыю дзвюх сябровак, Машы і Каці (імёны змененыя), спецыялістак у маркетынгу, якія стварылі канцэпцыю першых жаночых выступаў і распрацавалі іх іканаграфію. Сяброўкі ўпэўненыя, што жаночыя маршы змаглі змякчыць сітуацыю і прыпыніць гвалт. Аднак прыведзены прыклад, хутчэй, гаворыць на карысць тэорыі аб медыйным эфекце.

Эліс Бота задаецца пытаннем, ці можа быць любоў палітычнай катэгорыяй (якая выяўляецца ў празе справядлівасці), і прыходзіць да высновы, што палітычная кампанія альтэрнатыўных кандыдатаў была супрацьлеглай мадэллю да той палітычнай культуры, якая стваралася ў Беларусі на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў (Bota, 2021, p. 263), і менавіта таму атрымала такі водгук у грамадстве.

Асобная ўвага нададзена практыкам гвалту і стварэнню сістэмы беспакаранасці для супрацоўнікаў сілавых ведамстваў. Аўтарка таксама звяртаецца з крытыкай да еўрапейскіх інстытутаў за недастатковую ўвагу да беларускай праблемы.

Калі ў згаданых кнігах мы мелі справу з аналізам падзей і іх медыйнай рэпрэзентацыяй, то ў сваім артыкуле «The gender dimension of the 2020 Belarusian protest: Does female engagement contribute to the establishment of gender equality?» даследчыкі Васіль Навумаў і Вольга Мацвеева звяртаюцца да пытання аб звязаных з гендарам наступствах пратэсту: якім чынам тыя паўплывалі на публічную сферу? Яны адзначаюць, што адбылася сімвалічная апрапрыяцыя публічнай сферы. Пры гэтым грамадства застаецца патрыярхальным, а ў Global gender gap index за 2021 год Беларусь займае 33-е месца, апусціўшыся на чатыры месцы. Пры адсутнасці

дакладна вызначанай стратэгіі пратэсты не далі доўгатэрміновага эфекту. Таму даследчыкі робяць выснову пра неабходнасць лобінгу гендарнай роўнасці, фармавання інстытутаў і нулявой талерантнасці да гвалту.

У выступе «Comparing the Rhetorics of Femininity in the Belarus Awakening and the Arab Spring» на Кангрэсе даследчыкаў Беларусі (2021) Міхаэла Гранчаёва і Аляксей Кажарскі параўноўваюць жаночыя пратэсты ў Беларусі 2020 года і ў Егіпце ў 2012 годзе. Магчымасць такой захапляльнай гістарычнай паралелі даследчыкі абгрунтоўваюць патэрнітарным характарам абодвух грамадстваў, якім уласціва гегемонная маскуліннасць. Стаўленне да цела як да інструмента выхавання з'яўляецца адной з прыкмет такой грамадскай культуры. Менавіта таму пратэстоўцаў стыгматызуюць як парушальнікаў традыцый, такім чынам апраўдваючы ўжыванне да іх гвалту.

Даследчыкі параўноўваюць розныя стратэгіі рэакцыі грамадства на гвалт, якія шмат у чым аказваюцца аднолькавымі і для Беларусі, і для Егіпта.

У дыскусіі, якой суправаджалася абмеркаванне выступу даследчыкаў, адзначалася плённасць параўнальнага падыходу, які дазваляе асэнсаваць беларускі досвед у больш шырокім тэарэтычным і гістарычным кантэксце. Таксама каментатары адзначылі глыбокія гістарычныя карані ўдзелу жанчын у палітычным жыцці.

Наталля Паўловіч у сваім артыкуле «How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the 2020» падкрэслівае як ключавы момант менавіта агентнасць жанчын, прычым у асноўным у дыскурсе жаночай маральнай агентнасці, калі якасці самаахвярнасці і альтруізму ўспрымаюцца як неабходныя для дасягнення «агульнага дабра», а самі жанчыны разглядаюцца як адказныя за супольны грамадскі дабрабыт. Менавіта ў гэтым і бачыць даследчыца моцны бок пратэсту: удзельніцы ўспрымалі яго як апраўданы, бо ён зыходзіў з моцнага эмацыйнага ўзрушэння ў адказ на гвалт. Урэшце, даследчыца робіць выснову пра тое, што, хаця жаночы пратэст у Беларусі і разгортваецца ў межах патрыярхальнага бачання свету, гэта не значыць, што гэтыя межы не могуць быць перагледжаны і падарваны (што і практыкавалася падчас дэманстрацый, напрыклад, у некаторых крычалках і плакатах). Такім чынам, падрыў гендарных роляў уяўляецца многім жанчынам адзіным спосабам хаця б сімвалічна абараніць сваю годнасць.

## Літаратура

Bota, A. (2021) *Die Frauen von Belarus*. Berlin: Berlin Verlag, 240 p.
Navumau, V., Matveieva, O. (2021) *The gender dimension of the 2020 Belarusian protest: Does female engagement contribute to the establishment of*

*gender equality*? New perspectives, 2021 Available from: https://doi.org/10.1177/2336825X211029126. [Accessed 30 October 2021].

Paulovich, N. (2020) *How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the* 2020. Post-Election Protests. In: Slavic Revue, 80. No. 1.

Ramanava, I. (2020) *Die Wurzeln der Gewalt*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 114–120.

Shchyttsova, T. (2020) *Der traumatische Weg zu Neubeginn*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 55–63.

Shparaga, O. (2021) *Die Revolution hat ein weibliches Gesicht. Der Fall Belarus*. Berlin: Suhrkamp, 234 p.

Solomatina, I. (2020) *Die Revolution hat kein feministisches Gesicht*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 41–54.

Grancayova, M., Kazharski, A. *Comparing the Rhetorics of Femininity in the Belarus Awakening and the Arab Spring* (выступ на Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі, Коўна, кастрычнік 2021).

Коршунаў, Г. Гарызантальная сацыяльнасць як вынік першага этапу беларускай рэвалюцыі (выступ на Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі, Коўна, кастрычнік 2021).

## References

Bota, A. (2021) *Die Frauen von Belarus*. Berlin: Berlin Verlag, 240 p.

Grancayova, M., Kazharski, A. *Comparing the Rhetorics of Femininity in the Belarus Awakening and the Arab Spring* (presentation at the International Congress of Belarusian Studies, Kaunas, October 2021).

Korshunau, G. Garyzantal'naya satsiyal'nasts' yak vynik pershaga etapu belaruskai revaliutsyi [Horizontal sociality as a result of the first stage of Belarusian Revolution] (presentation at the International Congress of Belarusian Studies, Kaunas, October 2021).

Navumau, V., Matveieva, O. (2021) *The gender dimension of the 2020 Belarusian protest: Does female engagement contribute to the establishment of gender equality*? New perspectives, 2021 Available from: https://doi.org/10.1177/2336825X211029126. [Accessed 30 October 2021].

Paulovich, N. (2020) *How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the* 2020. Post-Election Protests. In: Slavic Revue, 80. No. 1.

Ramanava, I. (2020) *Die Wurzeln der Gewalt*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 114–120.

Shchyttsova, T. (2020) *Der traumatische Weg zu Neubeginn*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 55–63.

Shparaga, O. (2021) *Die Revolution hat ein weibliches Gesicht. Der Fall Belarus*. Berlin: Suhrkamp, 234 p.

Solomatina, I. (2020) *Die Revolution hat kein feministisches Gesicht*. In: Rostek, A., Weller, N., Weiler, T. and Wünschmann, T., ed. BELARUS! Das weibliche Gesicht der Revolution. Berlin: edition.fotoTAPETA, pp. 41–54.